Уступная кампанія заўсёды мела вялікі палітычны і сацыяльны рэзананс у нашым грамадстве. І галоўная задача — забяспечыць кантроль за няўхільным захаваннем дзейнага заканадаўства.

СТАР 2

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

31 КАНАЛ

Анонс лепшых фільмаў на кожны дзень.

Напэўна, цвік — тая рэч, якая знойдзецца ў любым доме. Магчыма, цвік у гісторыі ўзнік тады, калі чалавеку спатрэбілася стварыць сабе больш-менш цывілізаваныя інструменты і жыллё.

СТАР 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 108 (27223) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

УДЗЕЛЬНІКАМ XII НАЦЫЯНАЛЬНАГА ФЕСТЫВАЛЮ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ

Дарагія сябры!

Прыміце сардэчныя віншаванні з нагоды адкрыцця XII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі.

Нездарма кажуць, што без песні няма народа. Яна ўяўляе сабой люстэрка жыцця, універсальную мову мастацтва, якая звязвае паміж сабой мінулае, сучаснасць і будучыню, увасабляе свет чалавечай душы, спадзяванні і пачуцці людзей. З простых кранальных радкоў і мелодый складаецца паэтычны вобраз нашай Радзімы.

Фестываль годна выконвае пачэсную місію захавання і развіцця традыцый беларускай песні і паэтычнага слова, прадстаўляе лепшыя ўзоры айчыннага музычнага мастацтва, адкрывае новыя творчыя імёны. Сёлета ён праходзіць пад знакам святкавання 130-гадовага юбілею Янкі Купалы і Якуба Коласа, што надае фестывальным мерапрыемствам асабліва высокае гучанне, заклікае нашых сучаснікаў да працягу традыцый вялікіх песняроў.

Упэўнены, што фестываль стане сапраўдным святам нацыянальнай культуры, падорыць шмат адкрыццяў і прыемных сустрэч з таленавітымі людзьмі, якімі так багата Беларусь.

Жадаю вам моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення, поспехаў, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ ПРАПРАЦАВАЦЬ ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ ПА РАЗВІЦЦІ АПК ДА 2020 ГОДА

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даручыў прапрацаваць план дзеянняў па развіцці аграпрамысловага комплексу Беларусі да 2020 года. Адпаведнае даручэнне Прэзідэнт даў 7 чэрвеня падчас рабочай сустрэчы з віцэ-прэм'ерам Міхаілам Русым.

Даручана таксама прапрацаваць перспектывы сельгасгаліны краіны ў прымяненні да ўмоў Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў плане ўмоў надвор'я пачатак года для сельскай гаспадаркі склаўся не ідэальна, але ў цэлым нядрэнна.

Асобную ўвагу Прэзідэнт звярнуў на забеспячэнне сельгаспрадукцыяй унутранага рынку і яе пастаўкі за мяжу. «Для нас гэта важна. Вы ведаеце, што $7 млрд экспарту мы павінны да канца пяцігодкі выдаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым важныя не толькі аб'ёмы продажаў, але і выгадная цана за экспартуемую прадукцыю. Як далажыў Міхаіл Русы, у гэтым годзе экспарт плануецца ў памеры $4,7 млрд. Паводле яго слоў, ва ўсіх катэгорыях гаспадарак і ў грамадскім сектары адзначаецца прырост вытворчасці, выконваюцца экспартныя прагнозы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што сельгасвытворчасць павінна быць эфектыўнай. Гэта з'яўляецца галоўнай умовай для росту заробкаў. У значнай ступені паляпшэнню ўмоў працы і павышэнню яе прадукцыйнасці садзейнічае мадэрнізацыя фермаў і жывёлагадоўчых памяшканняў, якая праводзіцца ў краіне. У перапрацоўчай прамысловасці адна з галоўных задач — дасягненне большай глыбіні перапрацоўкі прадукцыі, што дасць магчымасць для атрымання дадатковых даходаў.

Сур'ёзную ўвагу Аляксандр Лукашэнка даручыў надаць рабоце арганізацый «Белкаапсаюза» па закупцы ў насельніцтва дзікарослай прадукцыі, а таксама агародніны і садавіны, вырашчаных на асабістых падсобных гаспадарках. «Мы паставілі задачу, што «Белкаапсаюз» такой прадукцыі павінен закупіць на Br1 трлн рублёў. Гэта клубніцы, яблыкі, агуркі, ранняя капуста...» — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў забяспечыць будаўніцтва агароднінасховішчаў і пунктаў перапрацоўкі агародніны, дзе гэта неабходна, каб была магчымасць у зручным для пакупніка выглядзе і па выгаднай цане пастаўляць прадукцыю на ўнутраны рынак і за межы краіны.

Акрамя таго, Прэзідэнт даручыў ураду звярнуць асаблівую ўвагу на неабходнасць ліквідацыі пэўнага адставання ў развіцці вытворчай сферы ў аграгарадках у параўнанні з сацыяльнай.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗАВОЧНАЯ ПРАМАЯ ЛІНІЯ

ШТО ТАМ З СЭРЦАМ?

Па рэдакцыйным нумары **8 (017) 292 21 03** пакідайце, калі ласка, свае пытанні да **загадчыцы інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, урача-кардыёлага вышэйшай катэгорыі Наталлі Якаўлеўны ПАЛЯЎКОВАЙ** і **ўрача-кардыёлага блока інтэнсіўнай тэрапіі той жа ўстановы Ірыны Віктараўны ГРЫШЫНАЙ**. Спецыялісты адкажуць на старонках «Звязды».

НАВУЧЫЦЕ, ДЗЯДЫ, БОЧКІ КЛЯПАЦЬ!

СТАРЭЙШЫ жыхар вёскі Валосавічы Мікалай Мікалаевіч КРЫЖАНКОЎ (на фота справа) дэманструе аднавяскоўцам сапраўдны прыклад жыццялюбства — ён дагэтуль уласнымі рукамі вырабляе рэчы, вельмі неабходныя ў сялянскім побыце. Быць бондарам у нашы дні азначае мець ганаровае званне народнага майстра. 85-гадовы валосавец заслужыў гэтае званне вельмі даўно. Яшчэ ў вайну, навучыўшыся ад дзеда і бацькі, вырабляў бочкі, вёдры, рашкі, цэбры, даёнкі і маслабойкі. Вырабляў, бо трэба было выжываць.

Цяпер гэткай неабходнасці няма, і разам з тым бондар шкадуе, што гіне рамяство: каму перадаць майстэрства і найбагацейшы рамесніцкі вопыт? Але хто ведае, ці не стане пераемнікам бондара ягоны паўтарагадовы сусед Косцік Канцавы, якога дзед Віктар (на фота злева) змалку далучае да сялянскай працы?

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Чачэрскі раён.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір СЯМАШКА, першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь:

Беларусь можа адмовіцца ад імпарту венесуэльскай нафты. У сённяшняй сітуацыі няма эканамічнай рацыі гэту нафту імпартаваць. Разам з тым, канчатковае рашэнне па гэтым пытанні яшчэ не прынята.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 21°
Віцебск	+ 18°
Гомель	+ 19°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 17°
Мінск	+ 19°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.06.2012 г.

Долар ЗША	8240,00	▼
Еўра	10350,00	▼
Рас. руб.	256,00	▲
Укр. грыўня	1020,43	▼

Мікалай КАЗАК:

«ПАД ВЫНАХОДНІЦТВЫ ТРЭБА СТВАРАЦЬ ФІРМЫ»

Размова з дэпутатам і вучоным пра самы цікавы і цяжкі занятак у свеце

З намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, доктарам фізіка-матэматычных навук, акадэмікам Мікалаем КАЗАКОМ «Звязда» размаўляла пра ўмовы, неабходныя беларускай навуцы для забеспячэння прарыву ў эканоміцы.

— Прэзідэнт у сваім Пасланні казаў пра неабходнасць змены сістэмы кіравання навукай. Ці мае ўвогуле навука патрэбу ў кіраванні?

— Натуральна. Усё мае патрэбу ў кіраванні. Ні ў адной краіне свету навука не працуе незалежна ад урада і эканомікі. Прызначэнне ўсёй навукі — дапамагаць вытворчасці рабіць канкурэнтаздольную прадукцыю.

Увогуле адрозніваюць фундаментальную і прыкладную, або інжынерную навукі. Першая займаецца даследаваннямі агульных заканамернасцяў і з'яў, а інжынерная — канкрэтнымі распрацоўкамі. Ва ўсім свеце існуе такі падзел працы ў навуцы.

Калі мы кажам пра неабходнасць дапамагаць вытворчасці, то павінны мець на ўвазе інжынерную, прыкладную навуку. Аднак дакладнага размежавання паміж фундаментальнай і прыкладной навукай не існуе. Фундаментальныя даследаванні праз некаторы час могуць стаць прыкладнымі. Спачатку адкрылі такую фізічную існасць прыроды, як электрычнасць, а потым, праз шмат гадоў, зрабілі лямпачку. Нестабільнасць атамаў была адкрыта ў канцы XIX стагоддзя, і толькі праз 46 гадоў пабудавалі першы атамны рэактар.

Важна разумець, што фундаментальная навука працуе на заўтрашні дзень. Калі яе не будзе ў нашай краіне, то з цягам часу мы перастанем разумець, што ўвогуле адбываецца ў свеце ў галіне навукі.

— Пытанне пра неабходнасць фундаментальнай навукі сёння яшчэ стаіць?

— Безумоўна. Ёсць невялікія краіны, якія адмаўляюцца ад фундаментальнай навукі. Некаторы час па гэтым шляху рухалася Японія, але цяпер яна вымушана шукаць ідэі. Справа ў тым, што сёння вучоныя не спяшаюцца дзяліцца прынцыповымі адкрыццямі ў галіне хіміі, біялогіі, фізікі і іншых навук, якія могуць прынесці практычную карысць.

Я згодны з тым, што мы не павінны раскідвацца, што сродкі трэба канцэнтраваць вакол невялікай, але неабходнай нашай краіне колькасці навуковых кірункаў. З іншага боку, нельга гэтыя кірункі кардынальна мяняць. Навука сёння настолькі складаная, што за кароткі час пераарыентавацца немагчыма. Каб некага апярэджваць, трэба ведаць сусветныя дасягненні. Для гэтага патрэбны дзесяцігоддзі. Прарывы адбываюцца, калі колькасць перарастае ў якасць.

Падобна таму, як пажарныя ўзбіраюцца на мноство драбін, рухаецца навука ў розных краінах. Адзін аднаго апярэджваюць і падымаюцца ўгору. Аднак каб падняцца, кожнаму трэба пераадолець няпросты шлях. Навука — цяжкая, карпатлівая і невясёлая праца. Бо каб стаць, напрыклад, вучоным-фізікам, трэба ведаць безліч формул, рашыць бясконцае мноства ўраўненняў, зразумець сутнасць велізарнай колькасці фізічных працэсаў. Толькі фанатыкі здольныя стаць сапраўднымі вучонымі. Такіх людзей — адзінкі. І ва ўсіх краінах іх, як, правіла, берагуць.

Сёння ў навуковым свеце вядомае імя доктара Філіпа Ё, якога называюць архітэктарам інавацыйнай палітыкі Сінгапура і скупшчыкам сусветных талентаў. Ён спачатку падняў абарончую прамысловасць сваёй краіны, потым вывеў на перадавую лінію яе камп'ютарныя тэхналогіі, пазней — хімічную прамысловасць. А цяпер стварае ў краіне слой навукоўцаў і інавацыйных прадпрымальнікаў.

СТАР 2

■ Прыватызацыя

Зафіксаваны рэкордны продаж акцый завода пеністых вінаў

Беларуская валютна-фондавая біржа зафіксавала рэкорд па продажы акцый Мінскага завода пеністых вінаў. За адзін дзень таргоў 6 чэрвеня было прададзена акцый больш, чым за ўвесь папярэдні месяц, паведаміла карэспандэнту «Звязды» ТАА «Агенцтва дзелавых сувязяў».

13986 акцый завода на суму амаль 2 мільярды 400 мільёнаў беларускіх рублёў — такі вялікі аб'ём таргоў перавысіў продаж акцый за ўвесь перыяд, пачынаючы з 2 мая (па звестках на 5 чэрвеня, было прададзена 12889 акцый). Рост колькасці заявак па куплі напярэдадні заканчэння таргоў ужо адзначаўся. Аднак 5 чэрвеня ён яшчэ вырас (за адзін дзень паступілі заяўкі на амаль 3 тысячы акцый). Прададзена ўжо 26875 акцый на суму больш за 4,5 мільярда рублёў, альбо 11,2% ад усяго аб'ёму дадатковага выпуску. Нагадваем, што продаж акцый скончыцца 15 чэрвеня. Кошт адной акцыі — 171450 беларускіх рублёў.

За май золатавалютныя рэзервы Беларусі павялічыліся на 81,1 млн долараў

Па папярэдніх звестках, на 1 чэрвеня аб'ём золатавалютных рэзерваў Беларусі ў вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ склаў 8,0563 млрд долараў ЗША, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. А значыць, за май гэты паказчык вырас на 81,1 млн долараў. У нацыянальным вызначэнні рэзервы роўныя 9,5628 млрд долараў. Рост склаў толькі 34,1 млн. Прырост грашовых запасаў выкліканы дадатным сальда куплі-продажу Нацбанкам замежнай валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы. Пры гэтым Нацбанк і ўрад выканалі ў поўным аб'ёме ўсе знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў замежнай валюце.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

«І ТЧЭ, ЗАБЫЎШЫСЯ, РУКА...»

СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ: калі глядзіш на іх, то хочацца валодаць

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«БАГАЦЦЕ! Якое багацце», — думала я, калі пабачыла слуцкі пояс упершыню. У Беларусі іх убачыць не так і проста было ў звычайным рэжыме: тыя адзінкавыя экзэмпляры ці фрагменты паясоў, якія былі ў краіне, не надта даступныя для вачэй. Пакуль не прыехала выстава з Расіі. Нашы суседзі багатыя на цуды беларускага ткацтва са слуцкай радзівілаўскай «персіярні». У розных расійскіх музеях захоўваецца паўсотні паясоў са Слуцка. Ёсць яны ў Літве, Украіне, Польшчы. Імі захапляюцца, іх берагуць, нават лічаць часткай сваёй гісторыі. А мы лічым сваёй спадчынай. Якая засталася ў гісторыі...

«Багатая! Я магу быць багатая», — думала я, разважаючы пра магчымасць адраджэння вытворчасці слуцкіх паясоў. Магчымасць нечакана разбагацець настолькі завалодала думкамі, што пра магчымасць рэальнага адраджэння складанага майстэрства нават не падумалася. А гэта ж традыцыя, якая, здаецца, страчана незваротна. Праўда, цуды прагрэсу пэўна ж дапамаглі б арганізаваць працэс вытворчасці вырабаў, падобных да слуцкіх паясоў. Ды і нічога няма немагчымага для сучаснага чалавека. Наогул, бываюць жа копіі мастацкіх шэдэўраў, не горшыя за арыгіналы. Але ж пры гэтым, усё роўна застаюцца копіямі, і кошт іх не такі, як у аўтарскага арыгінала. А нашы ж слуцкія паясы, тыя, што захаваліся праз стагоддзі, — ёсць арыгіналы працы аўтара, які ўкладаў сваю душу, рупліва, рукамі ствараючы мастацкі цуд. І тут мяне напаткалі няясныя сумненні: калі б сёння існавала вытворчасць паясоў, то ці былі б яны такімі ж каштоўнымі? Не, разважанні ўбок, здаецца, спакушае мяне думка пра багацце і хочацца раскласці па частках: з чаго ж складаецца каштоўнасць слуцкага пояса беларускага паходжання?..

Нават у тыя часы, калі паясы выкарыстоўваліся па прызначэнні, яны каштавалі да тысячы залатых і іх маглі дазволіць сабе толькі самая багатая шляхта і магнаты. Адзін пояс пераварочваўся рознымі бакамі ў залежнасці ад абставін: штодзённага выкарыстання, з нагоды ўрачыстасці ці жалобы. Найбольш дарагімі былі «літыя» паясы — у іх уводзілася срэбная ці залатая нітка. Вось яно!.. Але ж хіба толькі з-за каштоўных металаў яны так цэняцца? Вырабы былі сапраўды ўнікальныя — адзін майстар за год мог выткаць не больш за дзесяць паясоў, а мануфактура пад кіраўніцтвам Яна Маджарскага (турэцкага армяніна, які ўсходнім вырабам надаў асаблівы мясцовы каларыт і непаўторнасць) за год выпускала каля дзвюх соцень. Каштоўнымі яны сталі ў тым ліку і з-за сваёй унікальнасці.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай і заняпаду вытворчасці ў Слуцку паясы асабліва цаніліся. З сярэдзіны XIX стагоддзя слуцкія паясы сталі прыцягваць увагу калекцыянераў, у тым ліку расійскіх. Былі свае калекцыі і ў Беларусі.

Атрымаць у сваю калекцыю цэлы пояс — такая мара жывіла беларускіх музейшчыкаў з сярэдзіны мінулага стагоддзя. Першая і апошняя выстава слуцкіх паясоў у Мінску адбылася ў 1927 годзе ў Беларускім дзяржаўным музеі (зараз Нацыянальны музей гісторыі і культуры). На ёй былі выстаўлены толькі фрагменты, таму што цэлых паясоў у калекцыі музея не было.

Затое цудоўная калекцыя беларускіх культурных каштоўнасцяў, дзе былі і слуцкія паясы, была сабраная ў Вільні ў Беларускім музеі Івана Луцкевіча. Яе лёс склаўся трагічна пасля 1939 года: было ліквідавана Беларускае навуковае таварыства, яго члены арыштаваныя. Пасля вайны Беларускі музей у Вільнюсе быў зачынены, а яго фонды расфарміраваныя.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі ўласнасцю беларускага народа стала радзівілаўская калекцыя слуцкіх паясоў з 32 экзэмпляраў, перададзеных у Дзяржаўную карцінную галерэю. Ёсць нават фотаздымкі тых паясоў у Нацыянальным мастацкім музеі — з дэкаднай выставы ў Маскве 1940 года, і ёсць каталог той выставы, дзе паказаны радзівілаўскі збор з Нясвіжа. Але пасля вайны сляды гэтай калекцыі не знойдзены. Нават Нацыянальны мастацкі музей, для таго, каб паказаць жыхарам Беларусі каштоўныя паясы, дамаўляўся пра арганізацыю іх выставы з расійскім бокам.

Беларусь імкнулася вярнуць на радзіму каштоўнасці, якія за стагоддзі толькі выраслі ў цане (сёння слуцкія паясы могуць каштаваць да 100 тысяч долараў). Таму што калі дбаць пра культурны скарб краіны, то важна мець магчымасць сказаць: гэта наша і па паходжанні, і па вызначэнні, і па прыналежнасці.

І ёсць, безумоўна, ёсць гэтая вялікая спакуса — дакрануцца, мець магчымасць глядзець і ганарыцца — не столькі нават каштоўнымі матэрыяльнымі складнікамі пояса, колькі майстэрствам тых, хто ўласнымі рукамі ўмеў ствараць багацце. Ключавое тут: рукамі... Ад іх ішла прыгажосць, цеплыня, якая грэе душу дагэтуль, калі думаеш пра слуцкі пояс. Каштоўнасць насамрэч заклалі людзі, якія былі стваральнікамі цуду. Калі ведаеш, якія майстры былі на нашай зямлі, калі ўяўляеш, якія маглі б быць, калі б працягвалася традыцыя, то адчуваеш сябе багатым. Проста ад разумення таго, што недзе гэта ёсць, і гэта было створана маімі продкамі, якія сваім жыццём упрыгожылі свет... Вось гэта і сагравае. Ці сам пояс?

Ларыса ЦІМОШЫК.

ЦІ БУДЗЕЦЕ ВЫ АДЧУВАЦЬ СЯБЕ БАГАТЫМ, КАЛІ Ў ВАШАЙ ХАЦЕ З'ЯВІЦЦА СЛУЦКІ ПОЯС?

Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:

— Я буду адчуваць сябе духоўна багатым. Я буду рады захаванню нашай гісторыка-культурнай спадчыны, што на яе не забыліся, яе падтрымліваюць. Бо слуцкі пояс — гэта адзін з тых артэфактаў, які вылучае нас сярод іншых нацый. Вядома, матэрыяльна багацейшым я не стану. Але мяне будзе перапаўняць пачуццё гонару і радасці за тое, што наш народ клапоціцца пра захаванне сваёй гісторыі і культуры. Слуцкі пояс — гэта сімвал беларускасці, нацыянальнай дзяржаўнасці. Гэта духоўны сімвал нашага народа.

Наталля АЛЯХНОВІЧ, магістрант кафедры клінічнай імуналогіі і алергалогіі Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта:

— Вядома, я стала б адчуваць сябе багатай, бо слуцкі пояс — гэта сімвал беларускасці, беларускай годнасці, высакароднасці беларускай шляхты. Наогул, такая легендарная ў сваім родзе рэч. Але калі б слуцкія паясы з'явіліся ў кожнай хаце, калі б іх растыражавалі, то, магчыма, яны перасталі б быць такой каштоўнасцю, такім сімвалам. Сталі б побытавым атрыбутам, да якога б прывыклі і перасталі заўважаць.

Артур ВАКАРАЎ, дызайнер:

— Я яго сфатаграфую і вазьму ў працу, і буду па матывах слуцкага пояса прыдумляць нешта сваё. Усе рэчы, якія ёсць у мяне ў доме, я выкарыстоўваю ў сваёй дызайнерскай працы. Хаджу, гляджу, і што на вочы трапляецца, тое і выкарыстоўваю. Але багацейшым я не буду сябе адчуваць — я не ведаю, колькі каштуе слуцкі пояс! Пафасна казаць, што я стаў бы духоўна багатым, калі б у мяне з'явіўся слуцкі пояс...

Падрыхтавала Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ISSN 1990 - 763X

«ПАД ВЫНАХОДНІЦТВЫ ТРЭБА СТВАРАЦЬ ФІРМЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З 2001 года па яго ініцыятыве ў Сінгапуры была запушчана спецыяльная праграма па падрыхтоўцы тысячы кандыдатаў навук. На кожнага аспіранта краіна выдаткуўвае мільён долараў, палова з якіх ідзе на аплату навучання за мяжой. Урад Сінгапура разлічвае, што гэтыя людзі будуць адыгрываць важную ролю ў навуцы і эканоміцы краіны. Такім чынам Сінгапур інвестуе сродкі ў людзей, якія будуць ствараць інавацыі.

Акрамя таго, для развіцця навукі неабходна сучаснае абсталяванне. Сёння кошт толькі адной лабараторыі можа скласці мільёны долараў. Але без гэтага немагчыма стварыць нешта новае. Мы ўмеем генерыраваць ідэі, але іх трэба рэалізаваць, а для гэтага таксама патрэбны сродкі.

— У Паўднёва-Усходняй Азіі вучоных прывабліваюць грашыма, а чым у нас?

— Навука — самы цікавы занятак у свеце. З ёй тут можа параўнаць толькі вандроўку. Ведаеце жарт: «Што такое навука? Гэта задавальненне ўласнай цікаўнасці за дзяржаўны кошт».

На жаль, сёння прэстыж навукі ў нас, лічу, не надта высокі. Заробак малодшага навуковага супрацоўніка зараз каля 1,5 мільёна рублёў...

— Пакуль мы не паўтарылі вопыт іншых краін па інвеставанні ў людзей, які ўзровень удаецца трымаць нашай навуцы?

— Нашы вучоныя маюць высокі сусветны рэйтынг. У фізіцы вядомы наш акадэмік Арловіч... Міжнародная навуковая лабараторыя аптычнай дыягностыкі Фраўнгофера — Сцяпанава пры Інстытуце фізікі дагэтуль не мае аналагаў. Сучаснае абсталяванне гэтай лабараторыі дазваляе нам працаваць з біялагічнымі клеткамі, даследаваць уздзеянне на іх лекавых прэпаратаў. Мы ствараем новыя дыягнастычныя прыборы для машынабудаўніцтва, сонечных элементаў, медыцыны...

У прамысловасці нашай краіны сонечная энергія пакуль не запатрабавана, хоць у нас больш сонечных дзён, чым у Заходняй Еўропе. Нашы распрацоўкі купляе Германія...

— Якімі яшчэ навуковымі кірункамі мы можам ганарыцца?

— Біятэхналогіі, хімія, лазерная оптыка, інфарматыка, машынабудаўніцтва, расліназнаўства...

Нам жыццёва неабходна падтрымліваць прыродазнаўчыя і тэхнічныя навукі. У канцы 90-х гадоў ЗША раптам даведаліся, што больш чым удвая страцілі сусветны рынак у галіне камп'ютарнай тэхнікі. Аказалася, што студэнтаў перасталі прывабліваць тэхнічныя і прыродазнаўчыя навукі, зменшылася фінансаванне ў навуку ў гэтай галіне. Амерыка адразу стала прымаць захады: накіравала дадаткова $30 млрд на развіццё гэтых навук, студэнтаў сталі заахвочваць праз гранты.

Вось і нам важна не згубіць свае пазіцыі ў машынабудаванні, сельскай гаспадарцы, біялогіі, хіміі, прыборабудаванні...

— За кошт чаго мы трымаем планку?

— За кошт савецкай навуковай школы. На жаль, у 90-х мы згубілі цэлае пакаленне: нехта з'язджаў за мяжу, нехта сыходзіў у бізнэс альбо фінансы. Моладзь сёння ёсць: у НАН працуе каля 20% маладых вучоных, але ад іх яшчэ рана чакаць поўнай аддачы. Каб стаць добрым вучоным, трэба працаваць 7-10 гадоў. Таму, дарэчы, нам сёння цяжка знайсці кадры на кіраўніцкія пасады — недастаткова навукоўцаў сярэдняга пакалення.

— Як складаецца сёння лёс беларускіх вынаходніцтваў?

— З боку заканадаўства ў нас створаны добрыя ўмовы. У якасці дэпутата я асабіста працаваў над 5 законапраектамі ў гэтай сферы: па гандлёвых знаках, па прававой ахове вынаходніцтваў, па інавацыйнай дзейнасці, аб аўтарскім праве, аб камерцыйнай тайне. Гэта ўсё адносіцца да інтэлектуальнай уласнасці. Лічу, што заканадаўства мы зрабілі не горш за сусветны ўзровень. Яно мае масу карысных, «прасунутых» нормаў, з улікам сучаснага стану навукі.

Вынаходніцтвы ў нас ёсць. Навуковыя ўстановы ацэньваюць па колькасці публікацый у рэйтынгавых навуковых часопісах. Згодна са звесткамі аўтарытэтных агенцтваў, штодня адбываецца каля 30 навуковых спасылак на беларускіх навукоўцаў. Гэта неблагі паказчык для невялікай краіны.

Ёсць у нас і патэнты. Некаторыя з іх выкарыстоўваюцца... Сёння ёсць прапанова стварыць пры Дзяржаўным камітэце па навуцы і тэхналогіях Дэпартамент па камерцыялізацыі навуковых распрацовак і аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці з тым, каб усе яны былі выкарыстаны.

— У чым тут загваздка?

— Неабходна падключыць да навуковых распрацовак малыя і сярэднія прадпрыемствы, прыватны капітал. Справа ў тым, што буйному прадпрыемству складана ўкараніць інавацыю, таму і патэнты там выкарыстоўваюцца марудна. Пад вынаходніцтвы трэба ствараць невялікія фірмы. Напрыклад, Саудаўская Аравія прапанавала нашай лабараторыі распрацаваць прыбор для кантролю ракавых захворванняў падчас аперацый, дакладнасць якога больш высокая, чым у існуючых аналагаў. Калі ў мяне будзе патэнт, я змагу прадаць ліцэнзію бізнэсоўцу, які наладзіць вытворчасць такіх прыбораў, бо ў мяне для арганізацыі такой вытворчасці няма грошай. Аднак праз некаторы час нехта зробіць прыбор з новымі, яшчэ лепшымі якасцямі. Невялікая фірма без асабліых страт спыніць адну вытворчасць і распачне іншую. Для буйнога прадпрыемства гэта складана.

Гэта сусветная практыка. Інавацыі — тая вобласць, дзе найбольш выгадна спалучыць інтарэсы дзяржавы, прыватніка і вучонага.

Да таго ж трэба дазволіць перадачу інтэлектуальнай уласнасці любому беларускаму грамадзяніну і любой фірме, якія працуюць на тэрыторыі Беларусі, у выпадку, калі яны не выкарыстоўваюцца ў дзяржаўнай вытворчасці пэўны час. Бо не кожны можа выкупіць права на распрацоўку, аднак выкарыстанне яе дазволіць вярнуць грошы ў бюджэт у выглядзе падаткаў. Гэта лепш, чым пакінуць патэнт на паліцы.

— Інавацыйнае прадпрымальніцтва здольнае зрабіць краіну багатай, чаму ў нас гэта пакуль не спрацоўвае?

— У законапраект, які мы нядаўна разгледзелі і які цяпер знаходзіцца ў верхняй палаце, мы заклалі механізмы стымулявання і прынцыпы дзяржаўна-прыватнага партнёрства і венчурнага фінансавання. Гэта важныя ўмовы для стварэння інавацыйнага клімату ў краіне.

Акрамя таго, важна, каб інавацыйным бізнэсам займаліся высакакласныя спецыялісты ў сваёй галіне, лепш за ўсё — кандыдаты і дактары навук. Адначасова яны павінны быць выдатнымі бізнэсменамі, разбірацца ў эканоміцы і фінансах. Вось тады поспех будзе забяспечаны. Па гэтым шляху ідуць вядучыя ўніверсітэты свету.

У нас ёсць прыклады інавацыйных прадпрыемстваў, адно з іх — беларуска-японская фірма ЛОТІІС ТІІ, якая распрацоўвае і выпускае лазеры. Яе ўзначальвае кандыдат тэхнічных навук Уладзімір Конанаў, і ў камандзе там працуюць выдатныя вучоныя і канструктары.

— Якія галоўныя шляхі рэфармавання беларускай навукі вы бачыце?

— Неабходна сістэма, першы складнік якой — акадэмічная і ўніверсітэцкая навука. Другі складнік — навука галіновая, або фірменная, інжынерная, як у таго ж Конанава. Гэта тое, што нам трэба аднавіць. Трэці складнік — сістэма кіравання навукай. Тое, з чаго мы пачалі размову. Не трэба ўказваць навукоўцам, чым ім займацца, але неабходна вызначаць важныя для дзяржавы кірункі і выдаткоўваць на іх сродкі.

Сістэма павінна таксама забяспечваць сувязь паміж распрацоўкамі вучоных і патрэбамі вытворчасці. Наіўна думаць, што вучоныя знойдуць час для таго, каб адсочваць патрэбы вытворчасці. Неабходна дадатковая структура, якая займалася б камерцыялізацыяй вынаходніцтваў, сачыла за рынкам, за вытворчасцю і навуковымі навінкамі, адным словам — злучала вучонага з прадпрыемствам.

Неабходна і сістэма эканамічнага стымулявання навукі і інавацый. Зрэшты, патрэбна крыху іншая сістэма кантролю. Кантроль павінен быць навуковым, з боку грамадскай арганізацыі пры кіраўніцтве дзяржавы, Прэзідэнце або ўрадзе.

Не варта чакаць, што навука імгненна забяспечыць прарыў у эканоміцы. Навука патрабуе цярпення. Гэта павольны працэс. Да таго ж вельмі важна берагчы і цаніць таленавітых людзей — вучоных, інжынераў і канструктараў. І тады будзе вынік.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

АНАТОЛЬ РУБІНАЎ СУСТРЭЎСЯ З ПАСЛОМ В'ЕТНАМА

Тэрмін знаходжання ў Беларусі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Рэспубліцы Беларусь Данг Хыу Чана заканчваецца. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль Рубінаў учора сустрэўся з паслом і абмеркаваў з ім перспектывы развіцця міждзяржаўных адносін, міжпарламенцкага супрацоўніцтва і іншыя пытанні.

«За тыя тры гады, што вы ў нас правялі, вы вельмі шмат зрабілі для ўмацавання супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, — заявіў Анатоль Рубінаў. — Гэта тычыцца і парламенцкага супрацоўніцтва, і эканамічных сувязяў. У два разы павялічыўся тавараразварот паміж дзяржавамі за гэты час. Гэта нядрэнныя вынікі, але, безумоўна, патэнцыял у нас яшчэ большы». Данг Хыу Чан таксама пацвердзіў, што супрацоўніцтва паміж Беларуссю і В'етнамам пашыраецца. Асобна ён адзначыў тое, як яго прымалі ў нашай краіне: «Мяне сустракалі з адкрытым сэрцам і цеплынёй».

Дыпламатычныя адносіны з В'етнамам былі ўсталяваны ў 1992 годзе. За 20 гадоў было падпісана больш за 50 міжурадавых пагадненняў. У красавіку 2009 года падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнымі сходамі дзвюх краін. Актыўна ідзе гандаль з В'етнамам і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

У БЕЛАРУСІ ВЫХАДНЫЯ БУДУЦЬ ЦЁПЛЫЯ І ДАЖДЖЛІВЫЯ

У Беларусі ў бліжэйшыя выхадныя чакаецца цёплае, але дажджлівае надвор'е, паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.

У пачатку чэрвеня ў Беларусі ўстанавілася анамальна халоднае надвор'е, тэмпература паветра ў некаторыя дні была на 5-8 градусаў ніжэйшая за кліматычную норму. Аднак да канца гэтага тыдня ў атмасферы намеціліся пераўтварэнні.

У суботу месцамі ў начныя гадзіны, а днём у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўночы будзе плюс 8—15 градусаў, удзень чакаецца 19—26 градусаў цяпла. У нядзелю у асноўным па паўднёвай палавіне Беларусі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы, толькі ў Віцебскай вобласці будзе пераважна без ападкаў. Вецер паўднёва-заходні, умераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе плюс 10—17 градусаў, днём — 19—26 градусаў цяпла. У Гомельскай вобласці месцамі паветра прагрэецца да 28 градусаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ — ЭКЗАМЕН ДЛЯ ЎСІХ

13 чэрвеня ў Беларусі стартуе цэнтралізаванае тэсціраванне. Сёлета колькасць яго ўдзельнікаў скарацілася на 8,6 тысячы чалавек, аднак усё роўна канкурэнцыя на ўваходзе ў ВНУ абяцае быць, як заўсёды, вострай. Як і ў папярэднія гады, назіраць за прыёмнай кампаніяй будзе Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзенне уступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Пра тое, якое значэнне надаецца рабоце дзяржаўнай камісіі, сведчыць той факт, што склад і паўнамоцтвы членаў дзяржаўнай камісіі зацвярджаюцца штогод указам кіраўніка нашай дзяржавы. У камісію ўваходзяць чыноўнікі самага высокага рангу: памочнікі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, намеснікі старшыняў аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, дэпутаты, адказныя работнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў і Камітэта дзяржаўнага кантролю. А ўзначальвае камісію старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль РУБІНАЎ.

— УСТУПНАЯ кампанія заўсёды мела вялікі палітычны і сацыяльны рэзананс у нашым грамадстве, паколькі закранае інтарэсы вельмі многіх людзей: не толькі абітурыентаў і іх бацькоў, але і сваякоў, сяброў, школьных настаўнікаў... — падкрэсліў Анатоль Рубінаў у сваім выступленні на першым у гэтым годзе пасяджэнні камісіі, якое адбылося ўчора ў Камітэце дзяржаўнага кантролю. — І наша з вамі задача — забяспечыць кантроль за няўхільным захаваннем дзейнага заканадаўства як пры арганізацыі і правядзенні ўступных іспытаў, так і пры залічэнні абітурыентаў у навучальныя ўстановы, каб у маладых людзей, якія робяць першы крок у дарослае жыццё, не засталося ні цяню сумневу, што ўсё прайшло празрыста, сумленна і справядліва. Згодна з Канстытуцыяй, усе грамадзяне Беларусі маюць роўныя правы і роўныя магчымасці для атрымання адукацыі, але як яны скарыстаюцца сваімі магчымасцямі, вырашаецца ва ўмовах сумленнай канкурэнцыі падчас прыёмнай кампаніі.

На думку Анатоля Рубінава, укараненне ў краіне сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання (як бы да яе ні ставіліся, бо дасканалага ў свеце нічога няма), цалкам сябе апраўдала: дзякуючы ЦТ на працягу некалькіх апошніх гадоў у Беларусі не было выяўлена ніводнага факта карупцыі пры паступленні не толькі ў ВНУ, але і ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

— Для нашых суседзяў праблема карупцыі на ўваходзе ў ВНУ — праблема з праблем, а мы гэту праблему, спадзяёмся, вырашылі, — дадаў старшыня дзяржаўнай камісіі. — Прычым работа членаў дзяржаўнай камісіі — гэта толькі вяршыня айсберга: ні прадстаўнікі ўрада, ні работнікі апарата Адміністрацыі Прэзідэнта не могуць штодня прысутнічаць у навучальных установах і экзаменацыйных аўдыторыях, таму асноўная штодзённая нагрузка кладзецца на работнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю. Вось і сёлета да кантролю за ходам прыёмнай кампаніі будуць прыцягнуты па краіне больш як 200 работнікаў КДК. Акрамя таго арганізацыю і каардынацыю ўсёй работы будзе забяспечваць міжведамасная рабочая група дзяржаўнай камісіі, створаная на базе Камітэта дзяржаўнага кантролю, у склад якой увайшлі прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Міністэрства адукацыі, Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама абласныя камісіі, якія ўзначаляць старшыні абласных камітэтаў дзяржаўнага кантролю.

Анатоль РУБІНАЎ:
«Для нашых суседзяў праблема карупцыі на ўваходзе ў ВНУ — праблема з праблем, а мы гэту праблему, спадзяёмся, вырашылі...»

— Уступная кампанія — гэта свайго роду экзамен для органаў дзяржаўнага кантролю на прадмет яе арганізацыі і правядзення, — дадаў **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр ЯКАБСОН.** — Мэты нам зразумелыя, інструменты вызначаны, таму застаецца толькі падтрымліваць добра адладжаны механізм, не аслабляючы кантроль. Хачу падкрэсліць, што якасць студэнцкага білета мы забяспечылі за кошт якаснага правядзення прыёмнай кампаніі, а вось пра якасць дыпломаў выпускнікоў ВНУ нам яшчэ трэба будзе паклапаціцца. На наш погляд, у гэтай сферы існуе шмат праблем, таму трэба будзе падступіцца з усімі нашымі рэсурсамі ўшчыльную да гэтага пытання. Прызнаюся, што шырокае распаўсюджванне завочнай формы навучання, асабліва ў прыватных ВНУ, таксама выклікае ў нас пытанні. Але, акрамя завочнай, ёсць яшчэ і дыстанцыйная форма навучання. Будзем глядзець, наколькі якасную вышэйшую адукацыю атрымліваюць у нас студэнты завочнай і дыстанцыйнай формы навучання...

Анатоль Рубінаў нагадаў усім, што ў функцыі дзяржаўнай камісіі ўваходзіць не толькі кантроль за ходам уступнай кампаніі, але і аналіз прыёмнай кампаніі, таму кожны год на стол кіраўніка дзяржавы кладзецца справаздача з заўвагамі і прапановамі па ўдасканаленні дзейнага парадку адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

— Летась усе прапановы дзяржаўнай камісіі, сфармуляваныя па выніках яе работы, былі ўхвалены кіраўніком дзяржавы. На падставе выказаных рэкамендацый Міністэрствам адукацыі быў распрацаваны праект правілаў прыёму ў новай рэдакцыі, які прайшоў узгадненне з усімі зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі і ў вызначаным парадку быў унесены ва ўрад. Аднак, прымаючы пад увагу неабходнасць прадастаўлення абітурыентам часу для адаптацыі да новых умоў прыёму, прыняцце новай рэдакцыі правіл адклалі на пачатак 2012/2013 навучальнага года. Вырашылі яшчэ раз усё абмеркаваць, паслухаць розныя думкі і патлумачыць будучым абітурыентам усе нюансы новага парадку адбору, — падкрэсліў у сваім выступленні Анатоль Рубінаў.

Па словах **міністра адукацыі Сяргея МАСКЕВІЧА,** была падрыхтавана таксама пастанова міністэрства аб вядзенні ў ВНУ пры правядзенні ўступных іспытаў па прадмеце «Творчасць» абавязковага відэазапісу і гуказапісу. Гэта рабілася для максімальна аб'ектыўнага разгляду апеляцый ад абітурыентаў, нязгодных з выстаўленай ім адзнакай пры здачы вакалу, танца, акцёрскага майстэрства і гэтак далей. Аднак паколькі прыняцце новай рэдакцыі правіл было адкладзена, то і пастанова Міністэрства адукацыі не змагла прайсці юрыдычную экспертызу.

Сяргей Маскевіч праінфармаваў членаў дзяржаўнай камісіі, што сёлета, згодна з загадам Міністэрства адукацыі, кіраўнікам установаў адукацыі, вызначаных пунктамі правядзення ЦТ, было даручана забяспечыць правядзенне ЦТ толькі ў аўдыторыях, абсталяваных гадзіннікамі і мэбляй, якая дазваляла б размясціць абітурыентаў не больш чым па 4 чалавекі за сталом (пры наяўнасці праходаў з абодвух бакоў) ці па 2 чалавекі за сталом (пры праходзе толькі з аднаго боку) і ўкамплектаваць пункты правядзення ЦТ неабходнымі медыкаментамі.

У мэтах павышэння якасці тэставых заданняў, якія выкарыстоўваюцца пры правядзенні ўступных іспытаў, у тым ліку для мінімізацыі верагоднасці ўгадвання правільных адказаў, была праведзена таксама работа па змяненні спецыфікацыі тэстаў 2012 года. У прыватнасці, па шэрагу прадметаў была павялічана колькасць дыстрактараў у заданнях з выбарам адказаў з кола прапанаваных. Павялічылася таксама і колькасць заданняў з кароткім адказам і зменшана колькасць заданняў з выбарам адказаў з кола прапанаваных варыянтаў.

— З улікам шматлікіх зваротаў ад кіраўнікоў ВНУ і ССНУ, органаў дзяржкіравання, якія маюць у падпарадкаванні ўстановы адукацыі, а таксама абітурыентаў, просім дзяржаўную камісію разгледзець пытанне аб прадастаўленні ўжо ў гэтым годзе дадатковай магчымасці асобам беларускай нацыянальнасці, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежных дзяржаў, грамадзянам Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай рэспублікі, Рэспублікі Таджыкістан паступаць у беларускія ВНУ і ССНУ на платную форму навучання на ўмовах, прадугледжаных для іншаземцаў — гэта значыць, па выніках гутаркі. У большасці расійскіх ВНУ і ССНУ прыём беларусаў для навучання на платнай аснове ажыццяўляецца па выніках гутаркі, пры гэтым тэрміны падачы дакументаў фактычна не абмежаваны (навучанне распачынаецца па меры камплектавання груп). Станоўчае рашэнне гэтага пытання дазволіла б беларускім ВНУ і ССНУ эфектыўна рэалізоўваць палітыку нарошчвання экспарту паслуг, — дадаў Сяргей Маскевіч і нагадаў, што такая норма была ў праекце новых правіл прыёму.

Анатоль Рубінаў і Аляксандр Якабсон пабяцалі вывучыць гэта пытанне і прыняць мудрае рашэнне, якое б не пацягнула за сабой дэвальвацыю беларускіх дыпломаў. Маўляў, нельга дапусціць, каб дыпломы беларускіх ВНУ проста купляліся за грошы — за дыпломам павінна стаяць найперш якасная падрыхтоўка спецыяліста. Гэта прынцыпова...

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Гарачыя» лініі для абітурыентаў

Рабочая група дзяржаўнай камісіі ў Мінску **(017) 327 66 80.**
Брэсцкая абласная камісія **(0162) 21 00 33, 23 16 90.**
Віцебская абласная камісія **(0212) 37 33 90, 36 44 95.**
Гомельская абласная камісія **(0232) 70 16 38, 70 18 00.**
Гродзенская абласная камісія **(0152) 74 52 72, 77 04 47.**
Мінская абласная камісія **(017) 284 06 96, 284 07 06.**
Магілёўская абласная камісія **(0222) 22 11 84, 31 07 75.**
«Гарачая» лінія ў Міністэрстве адукацыі **(017) 222 43 12.**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЯЎ

АНАМАЛЬНАЯ ГАРАЧЫНЯ Ў ІНДЫІ ЗАГУБІЛА БОЛЬШ ЗА 100 ЧАЛАВЕК

У Індыі больш за 100 чалавек памерлі з-за моцнай спякоты, якая стаіць у апошнія дні, паведамляюць інфармагенцтвы. Так, у штаце Заходняя Бенгалія тэмпература на працягу некалькіх дзён трымаецца на адзнацы 47 градусаў. Гэта стала прычынай цэлага шэрагу смерцяў ад цеплавых удараў. Кіраўніцтва рэгіёна заклікала мясцовых жыхароў піць больш вады і старацца не выходзіць з дому ўдзень. У шэрагу штатаў краіны некаторыя ўстановы перайшлі на скарочаны рэжым працы. Беспрэцэдэнтная спёка ў Індыі стаіць з канца мая.

ЧАРГОВАЕ МАСАВАЕ ЗАБОЙСТВА МІРНЫХ ЖЫХАРОЎ АДБЫЛОСЯ Ў СІРЫІ

Каля 100 чалавек былі забіты напярэдадні ў раёне сірыйскага горада Хама, паведамляюць інфармагенцтвы. Апазіцыя заяўляе, што забойства здзейснена арміяй Сірыі. Паводле іх сцвярджэння, спецаперацыя ўрадавых войскаў у паселішчы Аль-Кубейр завяршылася сапраўднай разнёй. Пасля артабстрэлу вайскоўцы ўвайшлі ў вёску і пачалі забіваць яе жыхароў, выкарыстоўваючы пры гэтым не толькі агнястрэльную, але і халодную зброю. Сярод забітых каля 20 жанчын і 20 дзяцей. Афіцыйны Дамаск пацвярджае факт ваеннай спецаперацыі і гібель прынамсі 9 чалавек, аднак адказнасць за тое, што адбылося, улады ўскладаюць на паўстанцаў.

КАВА ПАЗБАВІЦЬ АД ПРАВАЛАЎ У ПАМЯЦІ

Тры кубкі кавы ў дзень — ідэальная порцыя, якая дазваляе абараніцца ад хваробы Альцгеймера, вылічылі супрацоўнікі Універсітэта Паўднёвай Фларыды ў рамках тэсціравання плазмы крыві групы добраахвотнікаў. Яны даказалі, што асобы з дрэннай памяццю, якія маюць у крыві высокі ўзровень кафеіну, да канца даследавання не сутыкаліся з паўнавартаснай дэменцыяй, піша The Telegraph. У асоб, у якіх развілася дэменцыя, паказчыкі кафеіну былі паніжаны на 51%.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ГОМЕЛЬСКУЮ ЕПАРХІЮ ЎЗНАЧАЛІЦЬ ЕПІСКАП ТУРАЎСКІ І МАЗЫРСКІ СТЭФАН

Гэта рашэнне было прынята на пасяджэнні Святога сінода Рускай праваслаўнай царквы пад старшынствам Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай работы Гомельскага гарвыканкама.

Папярэднікам епіскапа Тураўскага і Мазырскага Стэфана на чале Гомельскай епархіі быў архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх, які пайшоў з жыцця ў канцы красавіка 2012 года.

СЕНАСХОВІШЧА ЗНОСІЦЬ НЕ ДАВЯДЗЕЦЦА

У вёсцы Жасціннае Лагойскага раёна раніцай згарэла сенасховішча.

— Яно хаця і не эксплуатавалася — сёлета падлягала зносу з-за пагрозы абрушэння па прычыне сваёй лядашчасці — да месца пажару былі накіраваны шэсць адзінак пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі, — паведаміў галоўны спецыяліст цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Аляксей Рак. — Будынак быў памерам у плане 8х30 метраў, вышынёй 7 метраў. У ім захоўвалася 5 тон рэшткаў пазамінулагодняй саломы, якую і знішчыла полымя. Разглядаецца версія неасцярожнага абыходжання з агнём не ўстаноўленай пакуль асобы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СТРАШНЫ Ў ГНЕВЕ

У Віцебску ў камунальнай кватэры мужчына загінуў пасля таго, як абліўся бензінам і падпаліў сябе.

— Інцыдэнт адбыўся а дзявятай гадзіне вечара ў доме на вуліцы Леніна, у двухпакаёвай кватэры, размешчанай на пятым паверсе пяціпавярховага жылога дома. У адным пакоі пражываў мужчына з сужыцелькай, а другі гаспадыня здавала. Напярэдадні здарэння сужыцелька гаспадара пакоя вярнулася дадому, паміж імі адбылася сварка. Мужчына прыгразіў, што падпаліць сябе, — расказалі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — У парыве гневу ён сапраўды ўзяў каністру з бензінам, выліў на сябе і падпаліў. У гэты час у іншым пакоі знаходзіліся навучэнка музычнага каледжа і студэнтка ўніверсітэта, абедзве — першакурсніцы, якіх выратавалі з дапамогай аўталесак. 49-гадовага гаспадара пакоя пажарныя знайшлі на ложку абпаленым, без прыкмет жыцця.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕЙКІ «РТУТНЫ» ДЗЕНЬ АТРЫМАЎСЯ...

Цягам аднаго дня — літаральна за паўтары гадзіны — выратавальнікі тройчы выязджалі на сітуацыі, звязаныя са знаходжаннем ртуці. Здарэнні мелі месца ў трох розных месцах. Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, напачатку стала вядома пра знаходжанне герметычна закрытай шкляной ёмістасці з 30 грамамі вадкага металу на ўзбочыне прасёлкавай дарогі ў вёсцы Юшкі Калінкавіцкага раёна. Затым паступіла паведамленне, што ў лясным масіве паблізу вёскі Чэрні Брэсцкага раёна знойдзены дзве герметычныя закрытыя шкляныя ёмістасці з ртуццю, але ўжо вагой 5 кілаграмаў. І літаральна адначасова выратавальнікі былі вымушаны выязджаць у вёску Сямашкі Лідскага раёна. Тут каля жылога дома выявілі разлітую ртуць. На месцы работнікі МНС сабралі 150 грамаў вадкага металу, правялі дэмеркурызацыйныя работы. Ва ўсіх трох выпадках абышлося без пацярпелых. Уся знойдзеная ртуць будзе ўтылізавана.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ВЫНІКУ МАСАВАЙ БОЙКІ Ў СТОЛІНСКІМ РАЁНЕ АДЗІН ЧАЛАВЕК ЗАБІТЫ, АДЗІН ПАВЕСІЎСЯ

Крывавая бойка адбылася ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці, паведамілі БЕЛТА ў Следчым камітэце Беларусі.

Ноччу каля Дома культуры ў вёсцы Аздамічы адбылася масавая бойка. Маладыя людзі з Бярозаўскага раёна, якія прыехалі нібыта па камерцыйных справах, пасварыліся з мясцовымі. Завязалася бойка з удзелам каля 10 чалавек, затым яна перайшла ў панажоўшчыну. 20-гадовы жыхар Аздамічаў памёр у бальніцы, двое яго аднавяскоўцаў шпіталізаваны. Яшчэ траіх урачы адпусцілі дадому: ва ўсіх пярэзы, але іх здароўю нічога не пагражае. Адзін з удзельнікаў бойкі, 24-гадовы хлопец з Бярозаўскага раёна, паехаў у Гомельскую вобласць, у горад Тураў. Пасля яго знайшлі павешаным. Яшчэ адзін «баец» таксама знаходзіцца ў рэанімацыі. Заведзена крымінальная справа па п.13 ч.2 арт.139 (забойства з хуліганскіх меркаванняў) КК Беларусі. Праводзіцца расследаванне.

«ХІТ» КРАДЗЯЖОЎ — ІНСТРУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

Ці то грамадзяне актывізаваліся з правядзеннем рамонтаў, ці то злымыснікам усё адно, што браць з чужога, абы прыхапіць, але ўсё часцей у зводках фігуруюць крадзяжы найперш будаўнічых інструментаў і матэрыялаў. У сталічнай вобласці пацярпелыя толькі за адзін дзень з гэтай нагоды звярталіся да праваахоўнікаў неаднойчы. З гаспадарчай пабудовы ААТ «ПМК-32» у Маладзечне такім чынам да невядомага «сышла» бензапіла коштам больш за 2,8 мільёна рублёў. З новабудоўлі ў гэтым жа горадзе скралі 190 метраў электрычнага кабелю. Жыхар Узды свабодна зайшоў у пад'езд дома, што будуецца, каб выйсці адтуль з... 1,4 «куба» ненапласту коштам больш за 1,5 мільёна. Апошні належаў мясцоваму ПМК. У вёсцы Дзегцяроўка Мінскага раёна невядомы «абчысціў» легкавік мясцовага жыхара: скраў інструмент на суму больш за 6,2 мільёна рублёў. У вёсцы Пціч такім жа чынам абышліся з дачным домам мінчаніна: скралі адтуль чатыры аўтамабільныя колы, шрубавёрт, дзве абразныя машынкі, электрагэблік, перфаратар, 100 «квадратаў» ламінату і іншую маёмасць на суму больш за 22,1 мільёна рублёў. У мінчаніна, што будуе дом у вёсцы Бараўляны, падобнага інструмента скралі на 20,1 мільёна. Як паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, па названых выпадках заведзены крымінальныя справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні сваёй супрацоўніцы Базылевай Валянціне Адамаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

АБЗАЦ

Больш за 37 тыс. працоўных месцаў гатовы прадаставіць цяпер членам студэнцкіх атрадаў прадпрыемствы і арганізацыі Беларусі.

У мэтах прафілактыкі вострых кішэчных інфекцый дзяржаўны санітарны нагляд Беларусі забараніў выкарыстоўваць пры правядзенні ўрачыстасцяў у гандлёвых аб'ектах грамадскага харчавання прадукты, прыгатаваныя ў хатніх умовах. Забараняецца таксама гатаваць стравы з такіх прадуктаў. Гэта прадугледжана ў Пастанове галоўнага санітарнага ўрача краіны «Аб узмацненні захадаў па прафілактыцы вострых кішэчных інфекцый». З пачатку года ў Беларусі былі зафіксаваны 2 успышкі ВКІ, апошняя — у канцы мая ў Гродне. Там на працягу трох сутак пры наведванні адной кавярні захварэлі на сальманэлёз 11 чалавек. Носьбітамі сальманэл былі тры кухары, афіцыянт і кухонная рабочая.

Учора раніцай на тэрыторыі Бярозаўскай ГРЭС адбыўся пажар. З-за парушэння цэльнасці трансфарматара разлілося і загарэлася масла на плошчы 50 кв.м. Праз 20 хвілін пажар быў цалкам ліквідаваны. Ніхто не пацярпеў. На працы падстанцыі загаранне ніяк не адбілася.

ПОЎНЫ АБЗАЦ

У Казахстане ў адной са школ горада Рыдар у выпускніка адабралі шпаргалку, даўжыня якой складала 11 метраў. На папяровай стужцы было напісана каля 25 тыс. адказаў на трох прадметах, якія ўваходзяць у Адзінае нацыянальнае тэсціраванне (АНТ). Такую шпаргалку школьнік вырабіў шляхам склейвання палосак паперы. Шпаргалка была непрыкметна прынесена ў клас, аднак скарыстацца ёй выпускнік не паспеў. Падчас тэсціравання супрацоўнікі назіральнай камісіі адабралі ў яго стужку. Гэты інцыдэнт засмуціў кіраўніка аддзела адукацыі горада, які адзначыў, што дзіця ўсё ж рыхтавалася: «Гэта ж таксама праца».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ПАНЯДЗЕЛАК, 11 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.10, 7.35, 8.15, 8.35 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
7.05, 8.05, 18.45, 23.35 Зона Х.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
9.10 У цэнтры ўвагі.
10.05 Час Саюза.
11.00 «Зорнае жыццё». «Чаго хочуць халасцякі?».
12.10 Серыял «Маргоша».
14.05 М/ф: «Самы маленькі гном», «Прыгоды Кропкі і Коскі».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 «Мая праўда». «Уладзіслаў Галкін».
16.20 Серыял «Шырокая рака». 1-я серыя.
17.20 Серыял «Маруся. Вяртанне»
18.15 Арэна.
19.40 Калыханка.
19.55 Серыял «Сваты-4».
21.00 Панарама.
21.45 Форум.
22.45 Серыял «Падмані мяне-2».
0.00 Дзень спорту.
0.15 Драма «Агора».

АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00 (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Маст. фільм «Верныя сябры».
13.10 «Хачу ведаць».
13.40 «Кантрольная закупка».
14.10 «Модны прыгавор».
15.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
16.15 Камедыя «Дублёр».
18.20 «Адваротны адлік». «Стаханаўцы. Да і пасля рэкорда».
19.05 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Адкрыты фармат».
22.10 Серыял «Закрытая школа».
23.15 Маст. фільм «Стацкі саветнік».
1.30 Начныя навіны.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05 Кінапробы.
9.35 Навіны надвор'я.
10.05, 16.40 Серыял «Вар'яты-2».
11.05 Меладрама «Інсайт».
12.50 Кінааповесць «Да мяне, Мухтар!».
14.25 Пад грыфам «Вядомыя».
15.00, 0.45 Серыял «Мужчына ўва мне».
За прачытаныя літаратурныя творы зэльвенскім школьнікам даюць падарункі. Таму, хто не паленаваўся азнаёміцца са зместам як мінімум пятнаццаці кніг на працягу трох месяцаў канікулаў, супрацоўнікі Зэльвенскай дзіцячай раённай бібліятэкі абяцаюць перамогу ў конкурсе «Лета і кніга», вынікі якога будуць падведзены ў жніўні, перад новым навучальным годам.

— Для таго, каб атрымаць прыз ад бібліятэкі за актыўнае чытанне, патрэбна наведацца сюды за лета як мінімум пяць разоў, — расказала карэспандэнту «Звязды» загадчык Зэльвенскай дзіцячай раённай бібліятэкі Марыя Сітко. — Акрамя таго, мы будзем улічваць і тое, як школьнік удзельнічаў у мерапрыемствах, што праходзілі ў бібліятэцы на працягу лета. Прызамі за перамогу будуць, вядома ж, кніжкі.

Па словах Марыі Сітко, зараз школьнікаў найбольш цікавяць тыя творы, якія пазначаны ў спісах літаратуры, што задаюць на лета. За адзін раз вучню могуць выдаць не больш за пяць кніг. «Хіты» з беларускай літаратуры, якую бяруць у бібліятэцы дзеці, — творы Коласа і Караткевіча, а з сучасных аўтараў — творы Ніны Галіноўскай. Яе дзіцячыя вершы надта падабаюцца малодшым школьнікам.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

«ПЫТАННЕ ПАВЫШЭННЯ ПАМЕРУ ДАПАМОГІ ПА БЕСПРАЦОЎІ РАЗГЛЯДАЕЦЦА»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 7 чэрвеня.)

Ці павысіцца ў Беларусі памер дапамогі па беспрацоўі? Якая верагоднасць увядзення ў нашай краіне страхавання ад беспрацоўя? Якія спецыяльнасці ў дыфіцыце на рынку працы рэспублікі, а якія — у лішку? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Пётр ГРУШНІК і спецыялісты Мінпрацы Галіна ГРЫНЧУК і Таццяна КОРШЫКАВА.

ДЗІТЛЕНКА Станіслаў, Светлагорск:

— Ці чакаюцца ў бліжэйшыя месяцы буйныя вызваленні працоўнай сілы на прадпрыемствах? І на якіх?

Пётр ГРУШНІК:

— Мы кантралюем сітуацыю з масавым вызваленнем работнікаў прадпрыемстваў з мэтай аказання ім садзеяння ў працаўладкаванні пасля вызвалення. У адпаведнасці з заканадаўствам, наймальнік абавязаны пісьмова апавяшчаць органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аб масавым вызваленні работнікаў у сувязі з ліквідацыяй арганізацыі, спыненнем дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэннем колькасці ці штату работнікаў. У бліжэйшы час масавага вызвалення работнікаў не чакаецца. Па звестках наймальнікаў, у чэрвені чакаецца вызваленне 215 работнікаў з 10 арганізацый.

БАСАВЕЦ Ігар Фёдаравіч, Мінск:

— Ці ёсць прычына адмовіць мне ў водпуску з матывацыяй «у сувязі з вытворчай неабходнасцю» пасля адпрацаваных мной 11 месяцаў (водпуск да гэтага не браў)?

КОРШЫКАВА Таццяна:

— Згодна з артыкулам 170 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, наймальнік абавязаны прадастаўляць работніку працоўны водпуск, як правіла, штогод. У выключных выпадках, калі прадастаўленне поўнага працоўнага водпуску работніку ў бягучым працоўным годзе можа неспрыяльна адбіцца на нармальнай дзейнасці арганізацыі, дапускаецца са згоды работніка перанос часткі водпуску на наступны працоўны год. Пры гэтым у бягучым працоўным годзе наймальнік абавязаны прадаставіць не менш за 14 каляндарных дзён працоўнага водпуску, а частку, якая засталася, перанесці на наступны працоўны год.

Забараняецца непрадастаўленне працоўнага водпуску работнікам, якія маюць права на дадатковы водпуск у сувязі са шкоднымі і (ці) небяспечнымі ўмовамі працы. Такім чынам, да канца гэтага працоўнага года наймальнік абавязаны прадаставіць вам не менш за 14 каляндарных дзён працоўнага водпуску.

Надзея ДРЫЛА.

ДА ВЕДАМА

✓ На стане на 1 мая 2012 года ўзровень афіцыйна зарэгістраванага беспрацоўя складае ў Беларусі 0,7% да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.

✓ З агульнай колькасці заяўленых наймальнікам у службу занятасці вакансій амаль 80% — па рабочых прафесіях.

✓ Сёння на 1 беспрацоўнага ў рэспубліцы прыходзіцца 2 вакансіі, а ў Мінску — каля 7 вакансій.

✓ Сярэдняя працягласць беспрацоўя па рэспубліцы ў мінулым годзе складала 3,7 месяца. Для параўнання: у 2005 годзе яна складала 5,8 месяца.

Распавёў Пётр Грушнік і пра змены ў заканадаўстве аб занятасці (у маі 2012 года Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ухваліла праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь»). У прыватнасці, чакаецца, што грамадзяне, звольненыя па ўласным жаданні, але па ўважлівай прычыне, змогуць рэалізаваць права на атрыманне стыпендыі ў павялічаным памеры і прызначэнне дапамогі па беспрацоўі. Акрамя таго, у мэтах павышэння сацыяльнай падтрымкі беспрацоўных, якія страцілі працу, прадугледжана павелічэнне памераў стыпендый. Для грамадзян, якія страцілі працу ў выніку мадэрнізацыі вытворчасці, прапануецца ўстанавіць стыпендыю ў памеры 8 базавых велічынь.
З прыняццем закона жанчыны, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, атрымаюць магчымасць прайсці прафесійнае навучанне за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца на мерапрыемствы па забеспячэнні занятасці насельніцтва. У перыяд навучання ім будзе выплачвацца стыпендыя.
У закон аб занятасці ўводзіцца артыкул, які вызначае абавязкі беспрацоўных. Адначасова праектам удакладняюцца і абавязкі наймальнікаў. У прыватнасці, прапановаўецца, каб наймальнікі пісьмова, на працягу 3 дзён, інфармавалі органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аб увядзенні рэжыму няпоўнага працоўнага часу, а таксама аб з'яўленні вакансій. Гэта дазволіць аператыўна рэагаваць на змяненні, якія адбываюцца на рынку працы.

Управляющий в производстве
по делу об экономической несостоятельности (банкротстве)
ОАО «Пинская трикотажная фабрика «Волна» (далее — должник)
Козлов Александр Владимирович
ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ ДОЛЖНИКА.

Начальная цена продажи составляет 85 281 146 рублей, в том числе НДС — 14 213 577 рублей. Шаг аукциона — 5% от начальной цены.

Торги назначены на **10.07.2012 г. в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31, каб. № 106.

С дополнительными условиями аукциона можно ознакомиться по тому же адресу, а также по тел.: (017) 2374569, (029) 1600079.

Трастбанк

УВАЖАЕМЫЕ ВКЛАДЧИКИ ЗАО «Трастбанк»!

Информируем вас о том, что с 14 июля 2012 года будут действовать новые условия по следующим вкладам в иностранной валюте, оформленным до 13.01.2012 г. (включительно):

Вид вклада (депозита)	Ранее действующий размер процентных ставок	Новый размер процентных ставок (с 14.07.2012)
«VIP»	10 %	**7%**
«VIP»	8,2%	**7%**
«VIP»	7,5%	**7%**
«VIP+1%»	11 %	**7%**
«VIP+1%»	8,2%	**7%**
«VIP+1%»	7,5%	**7%**
«Шкварка»	9,5 %	**7%**

По возникшим вопросам Вы можете обратиться в контакт-центр Банка (**465** – с мобильного, **8 801 100 33 33** – бесплатный номер для звонков с городского телефона).

ЗАО «Трастбанк» УНП 100789114. Лиц. № 14 от 13.11.2008 г. НБ РБ.

УНП 601070249

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА: ЗДАНИЕ СКЛАДА

Адрес объекта и его наименование:	**Здание склада (инв. № 1003) площадью 520,6 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Колхозная, 33.** Начальная цена – 253 646 848 бел. рублей (с учетом НДС 20%).
Продавец:	ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2»
Порядок оплаты:	Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и публикацией объявления в СМИ. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10-ти банковских дней со дня проведения аукциона.
Сумма задатка:	10% от начальной цены на р/с 3012216860010 в ОАО Бел АПБ, г. Слуцк, ул. Копыльская, 7, код 921 УНП 601070249, ОКПО 031217156014 Получатель: Филиал «Автобусный парк № 2»
Организатор аукциона:	ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2», 223610, Минская обл., г. Слуцк , ул. Транспортная, 4
Документы, предоставляемые для участия в аукционе:	Заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение 10 % задатка. Дополнительная информация о документах размещена на сайте **www.minoblavtotrans.by (раздел «Новости»)**
Конечный срок и адрес приема заявок:	**10.07.2012 г. до 16.00** Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4 Филиал «Автобусный парк № 2», тел.: 8 017 954 64 54, факс: 8017 954 64 77, тел. 8017 294 13 95
Дата, время и место проведения аукциона:	**11.07.2012 г. в 12.00** Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Труд» (продавец)

извещает о проведении 26 июня 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Начальная цена продажи имущества одним лотом	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	капитальное строение – здание производственного корпуса (инв. № 005)	г. Речица, ул.Урицкого, 47	963 455 868	1 013 321 988	100 000 000
	котельная (инв. № 005-1) с инвентарным номером 340/С-27308, площадью 953,0 кв.м		12 896 400		
	здание проходной (инв. № 037а)		3 524 400		
	деревянный туалет (инв. № 06)		4 058 400		
	деревянный забор (инв. № 03)		1 995 600		
	забором из сетки рябица (инв № 04)		1 626 000		
	металлическими воротами (инв. № 02)		4 182 000		
	асфальтовым покрытием (инв. № 05) с инвентарным номером 340/С-294111, площадью 8,7 кв.м		16 344 000		
	водопроводная сеть (инв. № 055)		260 400		
	канализационная сеть (инв. № 056)		2 928 000		
	береза (инв. № 9009)		90 000		
	береза (инв. № 9010)		96 600		
	ель (инв. № 9006)		242 400		
	ель (инв. № 9005)		248 400		
	ель (инв. № 9007)		109 080		
	ель (инв. № 9008)		109 800		
	каштан (инв. № 9001)		113 280		
	каштан (инв. № 9002)		126 000		
	каштан (инв. № 9003)		130 800		
	каштан (инв. № 9004)		132 000		
	яблоня (инв. № 9013)		105 240		
	яблоня (инв. № 90115)		105 240		
	яблоня (инв. № 90111)		107 880		
	яблоня (инв. № 9012)		109 080		
	яблоня (инв. № 9014)		110 520		
	яблоня (инв. № 9016)		114 600		

ИМУЩЕСТВО РЕАЛИЗУТСЯ ОДНИМ ЛОТОМ!
Продавец: Открытое акционерное общество «Труд», г. 246022, г. Гомель, ул. Советская, 39
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.
Для участия в аукционе необходимо:
1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Труд») р/с 3012300240015 в Отделении № 314 г. Гомель головного филиала по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», код 151501768 УНП 400062954 ОКПО **по 22 июня 2012 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 22 июня 2012 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

К заявлению прилагаются следующие документы:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);
индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 10 июля 2012 года ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ИНТЕГРАЛ»

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)	- склад ОД № 3 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 210,9 кв.м, инвентарный номер 130/С-25620, инв. № бухг.10027); - склад ОД № 2 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 38 кв.м, инвентарный номер 130/С-25625, инв. №№ бухг. 10026, 51163); - автодороги (асфальтобетонное покрытие) площадью 230 кв.м (инв. № бухг. 20106); - ограждение (ж/б плиты, кирпич), площадью 254 кв.м (инв. № бухг. 20105); - таль электрическая ТЭ 320-51120 (инв. № бухг. 46322); - кран-балка, 3,2 т (инв. № бухг. 46371).
Сведения о земельном участке	Площадь 0,3167 га, кадастровый номер 144500000022000464, назначение – обслуживание зданий склада ОД № 2 и склада ОД № 3
Местонахождение продаваемого имущества	Брестская область, г. Пинск, ул. Брестская, 137Б
Сведения о продавце	ОАО «ИНТЕГРАЛ», ул. Казинца И.П., д. 121А, к. 327, 220108, г. Минск, телефоны: (017) 212 14 51, (029) 130 37 26
Сведения об организаторе торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327 48 36
Начальная цена предмета торгов (без НДС)	350 000 000 белорусских рублей
Сумма задатка	35 000 000 белорусских рублей

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества производится в следующем порядке: 50 процентов от цены продажи с учетом НДС перечисляются продавцу в течение 5 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи, оставшиеся 50 процентов – в течение 45 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Торги состоятся **10 июля 2012 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.06.2012 по 06.07.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327 48 36, (029) 130 37 26.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский Радиозавод» (продавец)

извещает о проведении 11 июля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Начальная цена продажи имущества одним лотом	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	миллиомметр Е6-18/1 (инв. № 04891)	г. Гомель, ул. Объездная, 9	1 420 000	17 780 000	1 700 000
	измерительный комплект К540 переносной (инв. № 01237)		7 990 000		
	мост постоянного тока Р333 (инв. № 00736)		2 790 000		
	мост постоянного тока Р333 (инв. № 00736)		2 790 000		
	мост постоянного тока Р333 (инв. № 00736)		2 790 000		

ИМУЩЕСТВО РЕАЛИЗУТСЯ ОДНИМ ЛОТОМ!
Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельский радиозавод», ул. Объездная, 9, 246027, г. Гомель.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.
Для участия в аукционе необходимо:
1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Гомельский радиозавод») р/с 3012111887011 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», МФО 151501369, УНП 400069535 **по 09 июля 2012 года** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 09 июля 2012 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

К заявлению прилагаются следующие документы:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);
индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

Номер лота по порядку	Местоположение земельного участка	Начальная цена (руб.)	Размер задатка (руб.)	Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения	Условие проведения аукциона	Характеристика земельного участка	Кадастровый номер	Инженерная и транспортная инфраструктура
1.	Бобруйский район д. Щатково, пер. 3-й Юбилейный, 17	7 979 150	797 915	4 869 174 (расходы возмещает победитель аукциона)	Наличие не менее двух участников	Площадь 0,1801 га	№ 720884012601000159	Имеется подключение к электроснабжению

ПРИМЕЧАНИЕ: Аукцион состоится **09.07.2012** года в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. М.Горького, д. 41, каб. 2, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Последний день приема заявлений – **30.06.2012** года до 17.00. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске 52 70 24.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10 % от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома № 3604712110312 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.
2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.
3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.
4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СЫЧКОВСКОГО СЕЛЬСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА З.С. Трубочка

Злева направа: дырэктар Музея гісторыі Магілёва Аляксей БАЦЮКОЎ, дырэктар па карпаратыўных камунікацыях кампаніі «Альпары» Валерый ТАРАСАЎ, міністр культуры Павел ЛАТУШКА абмяркоўваюць каштоўны набытак.

Студэнт гістфака вярнуў Статут ВКЛ 1588 года на радзіму

Студэнт-гісторык Андрэй РАДКОЎ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У свеце налічваецца 65 асобнікаў усіх трох выданняў Статута ВКЛ, а ў Беларусі не было ніводнага арыгінала. Дагэтуль!

Уладальнік маскоўскай антыкварнай крамы выставіў Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. на электронны аўкцыён. Асобнік ацанілі ў 45 тысяч долараў. Знайшоў інфармацыю пра гэта другакурснік гістфака БДУ Андрэй Радкоў. Ён і прапанаваў маладому і неабыякаваму да беларушчыны дырэктару Музея гісторыі Магілёва Аляксею Бацюкову зладзіць акцыю па зборы сродкаў на пакупку гэтага неверагодна каштоўнага для нашай краіны старажытнага дакумента.

Музей гісторыі Магілёва абвясціў дабрачынную акцыю па зборы сродкаў для выкупу Статута. Частку грошай ахвяравалі беларусы з розных рэгіёнаў краіны. А рэшту сумы — 30 тысяч долараў — ахвяравала кампанія «Альпары». Учора ў Мінску адбылася ўрачыстая перадача Статута ВКЛ 1588 года Музею гісторыі Магілёва.

— Мы вельмі ўзрадаваныя тым, што ў Беларусі нарэшце з'явіўся свой арыгінальны асобнік Статута ВКЛ, — гаворыць Аляксей Бацюкоў. — Цяпер наш галоўны клопат — граматна прэзентаваць Статут у Музеі гісторыі Магілёва, дзе ён і будзе пастаянна захоўвацца. Мы абяцаем, што гэты Статут будзе максімальна блізкі для кожнага магілёўца, будзем выстаўляць яго ў музеі і ён не пойдзе ні ў які іншы музей.

Ініцыятыўнасць магілёўскага музея зразумелая, высакародная і вельмі ўхвальная. Згадайма, што наш Статут (які, дарэчы, паслужыў асновай для стварэння канстытуцый многіх еўрапейскіх краін, а таксама такога вядомага дакумента, як Кодэкс Напалеона — Грамадзянскага кодэкса французаў. А Францыя ж — калыска дэмакратыі Еўропы!) быў распрацаваны падканцлерам Вялікага Княства Літоўскага старастам магілёўскім Львом Сапегам. Падканцлер выдаў Статут на ўласныя сродкі ў віленскай друкарні, заснаванай Пятром Мсціслаўцам на грошы магілёўскіх купцоў Мамонічаў. Так што магіляўчанам, так бы мовіць, сам Бог загадаў першымі ў Беларусі займець арыгінал гэтага Статута. Не магу пазбавіцца ад надзеі, што некалі магіляўчане будуць не адзінымі. Хаця, зрэшты, тут неадназначная сітуацыя. Калі статутаў у Беларусі стане вельмі шмат, то яны могуць страціць сваю ўнікальнасць, каштоўнасць і сімвалічнасць. Хаця Статут ВКЛ 1588 года вельмі моцны нацыянальны элемент.

Экзэмпляру Статута, які цяпер маюць беларусы, 480 гадоў. Ён быў надрукаваны ў друкарні Мамонічаў недзе ў 1594-1595 гг. на старабеларускай мове. Пазней Статут друкаваўся на польскай, рускай, французскай мовах.

— У гэтым асобніку ёсць сам тэкст, застаўкі, філіграні, канцоўкі. Аднак гравюр няма, — распавядае дырэктар Музея гісторыі Магілёва. — На жаль, яны былі згублены, хутчэй за ўсё, яшчэ да XIX стагоддзя. Сам Статут меў усе гэтыя старонкі, але ўмовы захавання ў перыяд з XVII па XIX стагоддзе былі не вельмі спрыяльныя. У XX стагоддзі была праведзена некаторая рэстаўрацыя тых старонак, якія захаваліся.

Гісторыя збору грошай на выкуп важнай гісторыка-культурнай каштоўнасці на старабеларускай мове была даволі доўгай. Не засталіся ўбаку і простыя беларусы, і мецэнаты з розных краін свету, якія неабыякава ставяцца да Беларусі. Так, напрыклад, беларус з Расіі Павел Бераговіч ахвяраваў 100 тысяч расійскіх рублёў. Нацыянальны банк Беларусі таксама заклікаў дапамагчы вярнуць Статут ВКЛ на радзіму. Намеснік старшыні Нацбанка Сяргей Дубкоў разаслаў лісты кіраўнікам камерцыйных банкаў з просьбай «разгледзець пытанне аказання бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі» Музею гісторыі Магілёва. Акурат на зварот Нацбанка і адгукнулася кампанія «Альпары» — яна ўнесла суму, якой неставала. «Альпары», па сутнасці, выкупіла Статут ВКЛ, бо ахвяравала дзве траціны ад агульнага кошту беларускага дакумента.

— Гэта вельмі важная падзея для нашага народа, — гаворыць міністр культуры Павел Латушка. — Наша гісторыя бярэ свой пачатак з Полацкага і Тураўскага княстваў, з Вялікага Княства Літоўскага. Гэта, фактычна, падмурак нашай культуры. Вельмі важна, што мы захоўваем нашу духоўную спадчыну. А факт таго, што акцыя па выкупе Статута набыла такі шырокі грамадзянскі розгалас, сведчыць пра неверагодны інтарэс нашага народа да ўласнай культуры. Вельмі важна, што разуменне неабходнасці вяртання гісторыка-культурных каштоўнасцяў у нашу краіну ёсць не толькі на ўзроўні дзяржавы, але і ў прыватных асоб.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Ржаўцеў. Туманец. Кварт. Пано. Амар. Кары. Бомба. Корж. Аорта. Паэт. Рогік. Раска. Лоб. Бан. Абак. Сода. Пагас. Карагум. Эра. Торба. Гага. Рыфма. Рок. Ром. Кадр. Аер. Кант. «Ака». Унтэр. Ажан. Барада. Бэра. Мальва. Кан. Акула. Лаванкін. Матросаў.

Па вертыкалі: Пампяруль. Пар. Крыса. Сарві. Опад. Пагуда. Малако. Ара. Аста. Ёлка. Зебу. Пэра. Анапа. Ірга. Бэра. Мальва. Кан. Акула. Лаванкін. Матросаў.

■ Лёсавызначальная дробязь

УСЁ КРУЦІЦЦА... ВАКОЛ ЦВІКА

Напэўна, цвік — тая рэч, якая знойдзецца ў любым доме. Магчыма, цвік у гісторыі ўзнік тады, калі чалавеку спатрэбілася стварыць сабе больш-менш цывілізаваныя інструменты і жыллё. Мабыць, роля цвіка за доўгія гады існавання не змянілася, але і такая дробязь здзівіць можа кожнага. І здзіўляе. Напрыклад, наведвальнікаў музея цвіка, які адкрыўся пры Рэчыцкім метызным заводзе — якраз да яго стагадовага юбілею.

Начальнік бюро інфармацыі і рэкламы Уладзімір Жалезка пра музей расказвае апантана, нібы пра любімае дзіця. Гаворыць, мэты ставілі амбіцыёзныя — каб увасобленыя тут ідэі адлюстроўвалі — ні больш ні менш — дзень заўтрашні. Для гэтага ў зале ўсталяваны сэнсарныя панэлі, дзякуючы якім можна не толькі зазірнуць у гісторыю прадпрыемства ажно да яго стварэння, але і даведацца пра канкрэтную біяграфію свайго дзеда. Вядома, калі ён працаваў на Рэчыцкім метызным.

— Музей наш жывы — сюды прыходзяць нашчадкі тых, хто працаваў у розныя часіны на прадпрыемстве, — расказвае Уладзімір Рыгоравіч. — Яны могуць даведацца аб працоўных подзвігах сваіх продкаў. Лёгка «падняць» сваю радаслоўную па адным прозвішчы — архіўная база даных захоўвае біяграфіі ўсіх былых супрацоўнікаў.

2,5-метровы цвік — бясспрэчны цэнтр і сімвал экспазіцыі. Дарэчы, ён хоць і дэкаратыўны, але ж вакол моцна закручваецца ўся гістарычная інтрыга. І адкрываюцца нечаканыя, у тым ліку трагічныя, старонкі мінуўшчыны. Напрыклад, такія: заснавальнікі дрыцяна-цвіковага завода, беларускія яўрэі, браты Уладзімір і Барыс Рык, якія да Кастрычніцкай рэвалюцыі мелі некалькі прадпрыемстваў у Рэчыцы і навокал, былі расстраляныя як ворагі савецкай улады — пасля таго, як зрабілі спробу перавезці вытворчасць за мяжу. Між іншым, прадпрымальныя браты стварылі завод у 1912 годзе дзеля забеспячэння фронта дротам, у тым ліку і калючым — улічылі, што ў гады першай імперыялістычнай ён будзе на піку продажу. Вядома, гэтая прадукцыя была запатрабавана яшчэ вельмі доўга.

Магчыма, хутка ў экспазіцыі з'явіцца і старажытны станок для вытворчасці цвікоў — яго замовілі за межамі прасторaў СНД. Практычна адноўлены станок, на якім выраблялі цвікі адразу пасля нацыяналізацыі, у 30-я гады XX стагоддзя. Тады для вытворчасці метызаў выкарыстоўвалі, напрыклад... старыя матрацы, з якіх выцягвалі спружыны. Выраблены з іх цвікі, гавораць, потым мянялі на прадукты... Зразумела, метызы з таго часу набылі новы выгляд (які — таксама можна пабачыць у экспазіцыі), але асноўнае прызначэнне засталося спрадвечна сімвалічным: змацоўваць. У тым ліку і стасункі паміж партнёрамі, сярод якіх асабліва вызначаюць знакамітую фірму «Ролс-Ройс». Сувеніры ад калег тым часам папаўняюць музей. Расійскія калегі прывезлі быццам бы з Афрыкі пачвару, якую цяпер тут называюць богам Цвіка — ну як абысціся без містыкі? У бліжэйшы час у музеі можна будзе пабываць не толькі рэальна, але і віртуальна — праз сайт прадпрыемства. І нават паназіраць за вытворчасцю ў анлайн-рэжыме, — абяцае Уладзімір Жалезка. А чалавеку з такім прозвішчам хочацца верыць.

Неўзабаве ўзгадваецца японская прытча: «З-за незабітага цвіка страцілі падкову. З-за страчанай падковы страцілі каня. З-за страчанага каня не даставілі данясенне. З-за гэтага прайгралі вайну». Так што наяўнасць-адсутнасць такой дробязі, як цвік, можа значна паўплываць на гісторыю.

Ды што там казаць — без яго нават газету не зробіш. І сёння галоўны рэдактар пачынае ранішнюю планёрку з пытання: «А які ў нас сёння «цвік» нумара?..»

Ірына АСТАШКЕВІЧ

Даты Падзеі Людзі



1922 — сёння спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Аляксеевіча Белага (8 чэрвеня 1922 — 17 верасня 1994), беларускага вучонага ў галіне механікі металапалімерных сістэм, трэння і кампазіцыйнага матэрыялазнаўства, прафесара, заслужанага вынаходніка БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР. Ім было напісана больш за 750 навуковых прац, у тым ліку 11 манаграфій. Аўтар 350 вынаходніцтваў, атрымаў 20 патэнтаў ЗША, Англіі, ФРГ, Японіі, Італіі, Францыі, Швецыі і іншых краін. 2 снежня 1994 года Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь была прынята Пастанова № 220 «Аб увекавечанні памяці У. А. Белага».

1971 — на экраны выйшаў фільм Леаніда Гайдая «12 крэслаў». Гайдай доўга марыў паставіць гэты твор — і, магчыма, таму ў яго атрымалася адна з лепшых экранізацый вядомага рамана. Нягледзячы на шматлікія недакладнасці і разыходжанні з сюжэтам і персанажамі кнігі, фільм Гайдая лічыцца адной з лепшых экранізацый рамана Ільфа і Пятрова.

1948 — у Кыштыме пад кіраўніцтвам Ігара Курчатава запушчаны першы савецкі рэактар для вытворчасці зброевага плутонію. Першы плутоній здабылі ў канцы 1947 года на доследнай ўстаноўцы ў колькасці 73 мікраграмаў. З пускам рэактара яго сталі здабываць па 100 г у суткі. Праз год была паспяхова выпрабавана першая савецкая атамная бомба, і ўсе першапраходцы атрымалі зоркі Герояў. Тут разам з Курчатавым мы назавём яшчэ імёны акадэмікаў: канструктара рэактара Мікалая Долежаля, навукоўца, які разбіраўся з плутоніям, Андрэя Бочвара і канструктара самой бомбы Юлія Харытона.

Было сказана

Максім БАГДАНОВІЧ (1891 — 1917) — беларускі паэт, празаік, публіцыст, даследчык, літаратуразнавец, перакладчык.

«Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак».

СВЯТА ПЕСНІ І ПАЭЗІІ

Як паведамлялася, Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі пачаўся сёння ў Маладзечне. Прымеркаваны ён да 130-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Сёлетні фэст ужо дванаццаты па ліку. Да гэтага часу ён ладзіўся раз на два гады, але нядаўна Савет Міністраў прыняў пастанову, згодна з якой свята ў Маладзечне будзе праходзіць штогод. Як адзначыў мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіл Фінберг, менавіта дзякуючы фестывалю знойдзена шмат новых імёнаў, талентаў, выхавана новае пакаленне кампазітараў, паэтаў, спевакоў, якія сталі лаўрэатамі, пераможцамі шматлікіх конкурсаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.39	21.39	17.00
Віцебск	4.21	21.37	17.16
Магілёў	4.29	21.29	17.00
Гомель	4.35	21.16	16.41
Гродна	4.56	21.52	16.56
Брэст	5.06	21.44	16.38

Месяц

Апошняя квадра 11 чэрвеня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Алены, Аверкія, Георгія, Івана, Карпа, Макара.*

К. *Ады, Ядвігі, Вільгельма, Максіма, Медарда, Севярына.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+20..+24°С	КІЕЎ	+21..+25°С	РЫГА	+14..+17°С
ВІЛЬНЮС	+18..+22°С	МАСКВА	+17..+20°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+15..+18°С

УСМІХНЕМСЯ

Кампанію бардаў выселілі з нумара гасцініцы не таму, што гучна ігралі на гітары, а таму што вакол вогнішча.

— Такім чынам, падсудны, ваша заключная прамова, прашу.

— А можна я яе зачытаю?

— Ну што ж, чытайце!

— Паабяцайце, што вы не будзеце мяне перабіваць.

— Ну добра, абяцаю... давайце толькі хутчэй.

— Леў Мікалаевіч Талстой! «Вайна і мір»! Том 1. ...

Надпіс у маршрутцы:

«Конкурс «Хто гучней грукне дзвярыма»скончыўся, усе прызы раздадзены».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 2529.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2012 года.